

# 50 Слаўнаму юбілею — сустрэчу дастойную

Вы бачыце два здымкі. На іх студэнт геолага-геаграфічнага факультэта Барыс Барысаў і легендарны крэйсер «Аўрора».

Барысу — дваццаць.

Чалавецтву — пяцьдзесят тысячагоддзяў.

Пяцьдзесят — нашай краіне Саветаў.

Роўна столькі ж часу, як прагрымелі залпы «Аўроры».

Пяцьдзесят год...

Юнак! Ты стаіш на парозе жыцця! Табе, Барыс, тваім сябрам сёння ўручаны камсамольскія білеты. Колер яго вокладкі — полымя ідэй Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, пераможнага залпа легендарнага крэйсера «Аўрора»...

Пяць ардэноў. Пяць адзнак роднай Камуністычнай партыі і ўрада заслуг Ленінскага камсамола перад савецкім народам. Ганарыся і даражы гэтым! Памятай, што камсамольскі білет натхняў тваіх равеснікаў на штурм Перакопа, саграваў сэрцы будаўнікам Магніткі і Днепрагэса, падымаў матросавых насустрач урагану свінца фашысцкіх кулямётаў...

Камсамольскі білет — рэвалюцыйны пашпарт лепшых сыноў і дачок нашага народа. Даражы ім і ніколі не забывай пра слаўныя старонкі жыцця Ленінскага Усесаюзнага Камуністычнага Саюза моладзі, памнажай і свята захоўвай іх!..

Бацькі і дзяды за паўвека пабудавалі грамадства, якое ідзе да самай светлай мары ўсяго чалавецтва — камунізма. Табе, камсамол, даручана прыняць у іх гэтую слаўную эстафету. Смела ўваходзь у жыццё. Няхай крокі твае заўсёды будуць цвёрдымі і ўпэўненымі.



## НА ФІНІШЫ СПАРТАКІЯДЫ— ВЫКЛАДЧЫКІ

У мінулую нядзелю, 12 лютага, у прыгарадзе Мінска «Зялёны луг» сабраліся супрацоўнікі ўсіх факультэтаў універсітэта, каб памерацца сіламі ў апошнім відзе спорта, уключаным у праграму спартакіяды выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ — у лыжных гонках.

Спаборніцтвы адкрылі жанчыны, стартаваўшыя на дыстанцыю трох кіламетраў. Першай фінішыравала лабарантка фізічнага факультэта Н. Глухава з вынікам 13 мінут 28 секунд. Сярод мужчын на дыстанцыі пяць кіламетраў перамогу атрымаў таксама прадстаўнік гэтага факультэта А. Кузнечык. Яго вынік — 22 мінуты 31 секунда. У агульнакамандным заліку першае месца занялі супрацоўнікі фізічнага факультэта, на другое выйшлі хімікі і трэцяе дасталася прадстаўнікам вылічальнага цэнтра.

## СТУДЭНТЫ СПАБОРНІЧАЮЦЬ

Працягваецца юбілейная рэспубліканская спартакіяда студэнцтва. Учора пачалося першынство вышэйшых навучальных установ Мінска па канькабежнаму спорту. У ім удзельнічае маладая каманда універсітэта.

На працягу двух дзён будуць змагацца за прызавыя месцы ў Лагойску семнаццаць нашых лыжнікаў. У складзе каманды майстар спорту Л. А. Капылова, кандыдат у майстры О. А Філіповіч і пятнаццаць першаразраднікаў.

Г. МАЛОЧКА,
выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.

# 352 ВЫСТАЎКІ

У цэнтры ўвагі масавай работы універсітэцкай бібліятэкі за мінулы год была прапаганда матэрыялаў XXIII з'езда КПСС, пленумаў ЦК КПСС і іншых важнейшых рашэнняў партыі і ўрада. Для гэтага выкарыстоўваліся самыя разнабаковыя формы вуснай і нагляднай прапаганды кнігі: выстаўкі, абмеркаванні літаратурных і навуковых навінак, дыспуты, агляды. Арганізоўваючы выстаўкі, мы стараліся адлюстраваць усе важнейшыя падзеі міжнароднага жыцця, падзеі, што адбываліся ў краіне, раскрывалі актуальныя тэмы па розных галінах навукі і тэхнікі.

На працягу года арганізавана 352 выстаўкі. Найбольш цікавымі з іх былі «Насустрач XXIII з'езду КПСС», «У барацьбе за камунізм мужнее юнацтва», «Яны былі першымі», «Ленін аб дзяржаве, праве і сацыялістычнай законнасці», «Ад першых дакрэтаў Савецкай улады да касмічных караблёў», «Мінск ардэнаносны!».

Вялікае месца ў рабоце бібліятэкі займалі дыспуты, асаблівасць якіх заключаецца ў тым, што ўдзел у іх прымалі не толькі студэнты гуманітарных факультэтаў, але і іншых. Гэтыя дыспуты праходзілі пры вялікай аўдыторыі. Часта збіралася да 200 чалавек. Праводзіліся яны ў інтэрнатах, чытальных залах, на факультэтах, у актавых залах. Вялікую цікаўнасць выклікалі дыспуты па раману В. Кажэўнікава «Шчыт і меч» і па аповесці Антонава «Разарваны рубель».

Актыўнасць праявілі студэнты і пры абмеркаванні аповесці А. Чакоўскага «Нявеста», твораў А. Вазнясенскага «Анціміры», Ланскай «Здарэнне». Канферэнцыя чытачоў на юрыдычным факультэце пад назвай «Вобраз савецкага чэкіста ў мастацкай літаратуры» прыцягнула вялікую ўвагу студэнтаў і праходзіла асабліва цікава. У канферэнцыі прынялі ўдзел Герой Савецкага Саюза Н. Міхайлашчаў .

У асобных студэнцкіх групах разам з куратарамі былі праведзены дыспуты па аповесцях Л. Уваравай «Год спакойнага сонца» і А. Гладзіліна «Гісторыя адной кампаніі», па раману Н. Дзяменцьява «Замужжа Таццяны Бяловай». Усяго за год было праведзена 13 дыспутаў.

У цяперашні час небывалага палітычнага і працоўнага ўздыму савецкіх людзей, уздыму, выкліканаму падрыхтоўкай да Кастрычніцкай рэвалюцыі, перад нашым калектывам стаяць вялікія задачы па пашырэнню прапаганды рашэнняў Камуністычнай партыі і ўрада, дасягненняў сацыялістычнага ладу за слаўнае паўстагоддзе.

І. СОМАЎ.



Горача паміж сабой спрачаюцца два фізікі Віктар Мартынюк і Леў Нахамчык. Побач стаіць задумёны Коля Паршэнка. Вырашыць складаную тээрэтычную праблему нялёгка...

## НОВЫХ АДКРЫЦЦЯЎ ТАБЕ, «МЕРЫДЫЯН»!

Прачытваючы свежы нумар насценгазеты геолага-геаграфічнага факультэта, кожны звяртае увагу на добрае афармленне, цікавыя матэрыялы, некаторыя новыя рубрыкі. Але што гэта? Газета называецца не «Географ», як раней, а «Мерыдыян».

— Цяпер яна заўсёды будзе выходзіць пад новай назвай «Мерыдыян», — сказалі нам члены рэдкалегіі. Факультэт жа наш цяпер не геаграфічны, а геолага-геаграфічны, разгон для творчасці стаў большым...

Сапраўды, газета змянілася не толькі сваей назвай, але і знешне. Бачыш тут шмат новага, карацей, — «Мерыдыян» узяў кірунак на шырокае асвятленне жыцця і дзейнасці факультэта, падрыхтоўкі да 50-годдзя Савецкай улады.

З новым нараджэннем! Творчых поспехаў табе, «Мерыдыян».

З. СЕРДЗЮКОЎ.

# НЕ ГОСЦІ, А ГАСПАДАРЫ

У 1966—67 НАВУЧАЛЬНЫМ годзе ў нашым універсітэце адкрыта стацыянарнае аддзяленне філасофіі на гістарычным факультэце. Гэта не толькі адпавядае запатрабаванням часу, але і універсітэцкім традыцыям. Больш як дзесяць год назад гэтага аддзялення ў нас не было. Але ў апошні час падрыхтоўка спецыялістаў па філасофіі вялася толькі праз завочнае навучанне, дзе ўжо адбыліся два выпускі. Вядома, мы не маглі хоць у некаторай ступені задаволіць патрэбу вышэйшых навучальных установ, тэхнікумаў і школ, дзе выкладаецца дыялектычны і гістарычны матэрыялізм, эстэтыка, навуковы атэізм, грамадазнаўства, спецыялістамі высокай кваліфікацыі па філасофіі. Аспірантура па філасофскіх навуках таксама ўжо даўно папаўняецца не за кошт выпускнікоў-філосафаў. З гэтых прычын нас і не магло не ўзрадаваць адкрыццё стацыянарнага аддзялення.

І вось набрана група з 25 чалавек. Конкурсныя экзамены ва універсітэт былі даволі цяжкімі. Гэта дало магчымасць прыняць абітурыентаў найбольш здольных да навукі. Студэнтамі сталі і камуністы Надзя Беляковіч, Фёдар Лазюк, якія ўжо маюць за плячыма вопыт выхаваўчай работы ў школе. Тадэуш Адула—былы токар, Анатоль Зелянкоў—літсупрацоўнік газеты на Гомельшчыне, Юра Шынкар—выкладчык музычнай школы. Побач са студэнтамі-стажнікамі на філасофскім аддзяленні займаюцца і выпускнікі сярэдніх школ, медалісты. Першае ўражанне аб іх засталося добрым.

Але, як кажуць, студэнт, які не здаў першую заліковую сесію,—яшчэ не студэнт. Не можа лічыцца студэнтам і той, хто не хвалюецца за інтарэсы сваёй навучальнай установы, якая павінна стаць роднай. Менавіта гэта я і хацеў прывіць у студэнтаў групы, дзе назначылі мяне куратарам.

Перш за ўсё хацелася, каб яны, першакурснікі, хутчэй перажылі псіхалагічную перабудову ад учарашняга школьніка і рабочага да сённяшняга студэнта, што дасць ім магчымасць глыбей адчуць рытм новага жыцця. Па-другое, хацелася, каб яны адчувалі сябе гаспадарамі ва універсітэце, а не гасцямі. Немалаважна было для кожнага з іх адчуць, што вучацца яны ў вельмі спрыяльны час і ў добрых абставінах. Цудоўныя вучэбныя карпусы, кабінеты, чытальныя залы, лабараторыі, вопытны прафесарска-выкладчыцкі састаў — усё гэта трэба ўяўляць пачынаючым студэнтам. З гэтай мэтай я правёў некалькі гутарак са сваімі студэнтамі-філосафамі, расказаў аб вучэбнай і матэрыяльнай базе універсітэта, аб нашых аўтарытэтных вучоных грамадскіх навук, аб тым, «як быць студэнтам». Зачытвалі мы перадавыя артыкулы «Правды» і «Известий», прысвечаныя пытанням жыцця навуковых установ. Усё гэта садзейнічала таму, што студэнты-філосафы з кожным днём усё больш і больш адчувалі адказнасць за сваю вучобу і паводзіны, адчувалі паўнату радасці ад таго, што яны з'яўляюцца прадстаўнікамі першага набору на філасофскае аддзяленне.

Як куратар, я пазбягаў залішняй апекі над студэнтамі. У іх ёсць добрыя важакі: камсорг Надзя Беляковіч, праформ Іван Рабыкін, стараста групы Фёдар Лазюк. У іх ёсць план мерапрыемстваў, згодна якога яны пабывалі ў гістарычных месцах сталіцы, у тэатрах і кіно. Палітінфармацыі яны праводзяць таксама самі. Наогул, я павінен зазначыць, што група філосафаў — жыццяздольная, дружная. Гэта адбілася становуча і на выніках сесіі. Сем студэнтаў (Аляксандр Байчароў, Міхаіл Віннікаў, Анатоль Зелянкоў, Вольга Ігнаценка, Уладзімір Далінін, Галіна Санюк, Юры Шынкар) здалі экзамены толькі на выдатна. Адну чацвёрку і астатнія пяцёркі мае Уладзімір Кузьмінаў. Добрыя вынікі ў Элы Белкінай, Ларысы Шывадровай, Уладзіміра Малінава і іншых. Наогул, трынаццаць чалавек не маюць здавальняючых адзнак.

Але першая сесія паказала, што не ўсе ў аднолькавай меры працавалі на працягу ўсяго семестра, што некаторыя першакурснікі спадзяваліся «ўсё схапіць за тры дні». Ім давялося выслухаць горкія папрокі сяброў на сходзе, які мы правялі перад канікуламі. Гэта быў цікавы сход, дзе кожны, няхай ён троечнік ці выдатнік, падзяліўся ўражаннямі аб першых экзаменах ва універсітэце. Студэнты, якія прышлі ў нашу ўстанову з вытворчасці, заявілі, што яны праверылі свае сілы, адчулі, што могуць вучыцца і будуць вучыцца лепш. Усе прышлі да адной думкі: магчымасці групы ў вучобе і грамадскім жыцці яшчэ далёка не вычарпаны, што група філосафаў можа паводзіць сябе і вучыцца значна лепш.

Добрага вам шляху ў нашым універсітэце, маладыя мае сябры!

С. Д. ЛАПЦЕНАК,
куратар групы, кандыдат філасофскіх навук.

# З ДАПАМОГАЙ КАМУНІСТАЎ

Калі перагортваеш ведамасці здачы зімовай сесіі, тут каментарыі, як кажуць, не патрэбны. У студэнтаў аддзялення палітэканоміі юрыдычнага факультэта толькі адна нездавальняючая адзнака. Вось, да прыкладу, экзамен па гісторыі народнай гаспадаркі: 8—выдатна, 13—добра і толькі 4 — здавальняюча. Добрыя веды паказалі эканамісты і па іншых дысцыплінах, а яны ў нас нялёгкія. Але цяжкасці, якія сустракаюцца ў нас, мы пераадольваем усе разам, дапамагаем адзін аднаму ў вучобе. У авангардзе нашага курса восем камуністаў, якія сваім стараннем і добрасумленнымі адносінамі да вывучэння праграмных дысцыплін робяць вялікі ўплыў на нас, камсамольцаў.

Па сутнасці, наша адзяленне зусім маладое, але яно ўжо заявіла аб сабе з дадатнага боку. За гэты час у нас выраслі выдатнікі вучобы Люба Дарогіна, Саша Отчык. Мы ганарымся імі і пастараемся не адстаць ад іх у вучобе.

Некалькі слоў аб тым, што перашкаджае нашай вучобе. Мы сустракаем сур'ёзныя цяжкасці з вучэбнымі дапаможнікамі. Так, напрыклад, мала каму ўдалося знайсці «Матэматычны аналіз» Былінскага (вучэбнік напісан з уклонам да нашай спецыяльнасці) і многа іншых неабходных кніжак.

Мы ўпэўнены, што традыцыі студэнтаў аддзялення палітэканоміі будуць з кожным годам узбагачацца. Але ў першую чаргу, мы, першакурснікі, павінны даць ім добры пачатак.

Г. БАРКУН,
камсорг аддзялення палітэканоміі.

## ДА 900-ГОДДЗЯ МІНСКА



# ТРЫНАЦЦАЦЬ «МУЖНЫХ»

*Прайшло ўжо даволі многа часу, як мінулі зімовыя канікулы, і, здавалася б, ужо трэба ўвайсці нашаму студэнту ў працоўную каляіну: наведваць бібліятэкі, лабараторыі, кабінеты, пачынаць рыхтавацца да летняй сесіі...*

*Рэдакцыя даручыла мне пацікавіцца, як пасля канікул працуюць ў кабінетах юнакі і дзяўчаты, чым яны там займаюцца.*

*І вось я ля дзвярэй, на якіх вісіць шыльда «Кабінет англійскай мовы». Асцярожна, каб не парушыць рабочых абставін студэнтаў, спрабую адчыніць дзверы. Цягну за ручку, а яны не адчыняюцца. Я тузаю яшчэ мацней — не паддаюцца. Тады незнарок учапіўся я за іх двума рукамі і пачаў грукаць. Але пераканаўшыся, што гэта ўсё марная работа (дзверы былі на замку), я ў роспачы падумаў: «Што рабіць?». Але тут жа сам сябе папракнуў, «Што я задумаўся?» У нас жа столькі ва універсітэце кабінетаў! І шпарчэй пайшоў да кабінета гісторыі. Але і тут мяне чакала няўдача. Без ніякай надзеі я з усёй сілай рвануў дзверы кабінета палітэканоміі. І... што ж вы думаеце? Там сядзеў студэнт. Адзін. Відаць драмаў. Ад майго грукату ён падняў галаву і здзіўлена залыпаў соннымі вачыма.*



*— Што, дружок, працуеш?*
*— Але, — зяўнуў ён...*

*— Да сесіі ўжо рыхтуешся? Тут ён з такім здзіўленнем паглядзеў на мяне, што мне стала сорамна за такое «недарэчнае» пытанне.*

*— Семінар заўтра? — працягваў я, думаючы выправіць сваю ніякаватасць...*

*— Які семінар?.. Што ты? Хто да семінара цяпер рыхтуецца?*

*— Проста так чытаеш?...*

*— Якое проста. Заўтра — экзамен. Трэба неяк хвост ліквідаваць, — з ганаровай фанабэрыстасцю і пачуццём самастойнасці адказаў ён.*

*І тут мне стала ўсё зразумела. Каб не перашкаджаць свайму субяседніку займацца патрэбнай навукай, я папрасіў прабачэння і накіраваўся да выхаду. Але не паспеў я зачыніць дзверы, як той, на каго я ўскладваў надзею, зноў палажыў на кнігу сваю буйную галаву і захроп.*

*Далей мой кірунак быў да кабінета крыміналістыкі. Там мяне сустрэла таксама адзінокая цішыня і адзінокія кнігі. У кабінеце грамадзянскага права — тое ж самае.*

*Абышоў я яшчэ тры кабінеты галоўнага корпуса. Знайшоўшы трынаццаць «мужных» студэнтаў, якія адважыліся ў пачатку семестра сесці за падручнікі, я папрасіў нашага карэспандэнта сфатаграфаваць адзін з пустуючых кабінетаў юрфака. Гэта было а шостай гадзіне вечара.*

*І. ШВЕДАЎ.*

# З рэдакцыйнай пошты

# РЭПАРТАЖ З АПОШНЯЙ ПАРТЫ

МЫ ў 8-й АЎДЫТОРЫІ біялагічнага факультэта. Сядзім за апошняй партай. Званок. Пачынаецца лекцыя па гісторыі КПСС. Надзежда Паўлаўна чытае сваю двухгадзінную лекцыю...

І-і-і... скрыпяць дзверы. Паказваецца першы спазніўшыйся. Уваходзіць рашуча і даволі ўпэўнена. Пяць хвілін пасля званка. «Хіба гэта спазненне?» — гаворыць яго выражэнне твару. Увайшоўшы спакваля ходзіць у пошуках месца, дзе сесці. Так, праблема перад ім складаная, бо палова аўдыторыі свабодна. Асабліва пярэднія парты.

...Зноў скрыпяць дзверы. Уваходзяць двое. Відаць, і іх таксама падвёў гадзіннік.

Цікава, колькі ж сёння прысутнічае? Адзін, два, тры... 102 студэнты з 186. Але і ім не да лекцыі. Хтосьці напружана рыхтуецца да прадстаячага калоквіума па заалогіі безпазваночных, а наперадзе схіліліся дзве галавы:

— Е-3!
Прамахнуўся!
Д-8!
Падбіў...
Ідзе «Марскі бой».

— У цябе пытанні да семінару ёсць? Дай перапісаць!—чутны шопат.

Побач адбываюцца гарачыя дэбаты аб мастацтве. Крытыкуюць фільм «Вайна і мір». Разачараваў П'ер Бязухаў («не так я сабе яго прадстаўляла»)...

У супрацілеглым кутку на апошняй парце сядзіць і гутарыць малады юнак з дзяўчынай з чорным бантам на галаве. Аб чым яны так з захапленнем размаўляюць цяжка здагадацца. Ва ўсякім разе іх не цікавіць тэма лекцыі. Наперадзе студэнты клапатліва канспектуюць кожнае слова выкладчыка...

А на пятай нехта мірна дрэмле, даносіцца ціхі храп.

Да канца лекцыі застаецца пяць хвілін. Усе заканчваюць свае справы. Звіняць манеты. Іх уладальнікі пойдуць купляць пончыкі...

Толькі Надзежда Паўлаўна не пачула званка. Не спяшаючыся, яна прадаўжае з такім жа запалам расказваць.

Ух! Званок! Подых аблягчэння. На пятай парце салодка падцягнуўся юнак. Стаміўся небарака. Добра, што перапынак. Шкада пакідаць групу, але што зробіш—у нас таксама калоквіум, да яго рыхтавацца трэба.

**Рэпартаж вяла студэнтка першага курса Л. Назарава.**

# ГУЧАЦЬ ГАЛАСЫ МАЛАДЫХ

**Шмат аматараў паэзіі сабралася ў ленпакоі студэнцкага інтэрната па Паркавай магістралі. Перад прысутнымі са сваімі вершамі выступілі члены літаб'яднання «Узлёт»: Алесь Разанаў, Мар'ян Дукса, Уладзімір Дзюба, Яўгенія Янішчыц і іншыя. Асабліва цёплымі апладысментамі ўзнагародзілі прысутныя вершы Сяргея Панізніка, якія ён прачытаў з вялікім хваляваннем і захапленнем.**

**Вечар прайшоў цікава, прысутныя змаглі шырэй пазнаёміцца з творчасцю сваіх студэнцкіх паэтаў.**

**А. КОЗІК.**

